**Вынікі летняй аздараўленчй кампаніі**

Занятасць навучэнцаў ДУА "Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа" ў летні перыяд ажыццяўлялася ў адпаведнасці з рэспубліканскай акцыяй "Мары нараджаюцца – мары збываюцца!", абласным праектам "Лета – 2022". Мэта дадзеных акцый - стварэнне ўмоў для адпачынку і аздараўлення дзяцей і падлеткаў, забеспячэння рознабаковага развіцця навучэнцаў праз сацыяльна значную дзейнасць, арганізаваны вольны час; супрацоўніцтва з арганізацыямі і ўстановамі соцыума з мэтай стварэння сістэмы развіваючага адпачынку.

Выхаваўчая работа ў перыяд летняга аздараўлення планавалася з улікам знамянальных дат і дзяржаўных святаў. Арганізавана пасяджэнне актыву дзіцячых грамадскіх арганізацый з мэтай забеспячэння актыўнасці вучняў у правядзенні мерапрыемстваў летняга перыяду.

27 мая 2022 г.праведзены метадычны рынг для педагогаў «Правілы арганізацыі летніх канікул», гутаркі-інструктажы з навучэнцамі «Бяспечнае лета». Класнымі кіраўнікамі, выхавацелямі дашкольных груп была вывучана папярэдняя занятасць вучняў у летні перыяд, у тым ліку непаўналетніх, якія прызнаны знаходзячыміся ў сацыяльна небяспечным становішчы.

З мэтай стварэння спрыяльных умоў для знаходжання выхаванцаў ва ўстанове дашкольнай адукацыі праведзена работа па выяўленні ў законных прадстаўнікоў выхаванцаў патрэбы ў наведванні дашкольных груп у летні перыяд.

На агульнашкольным бацькоўскім сходзе 28.05.2022 г. былі абмеркаваны пытанні:

"Арганізацыя аздараўлення дзяцей і падлеткаў у аздараўленчых лагерах у летні перыяд 2022 года»;

«Арганізацыі вольнага часу вучняў у час летніх канікул»;

"Адказнасць бацькоў за выхаванне дзяцей»;

”рафілактыка правапарушэнняў і злачынстваў у летні перыяд»;

"Папярэджанне ўжывання непаўналетнімі алкагольных напояў, наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў»;

"Недапушчальнасць пакідання дзяцей без нагляду» (тлумачэнне артыкула 159 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь «пакіданне ў небяспецы»). Пытанні бяспечнага адпачынку навучэнцаў пастаянна асвятляліся ў бацькоўскіх чатах класаў, матэрыялы размешчаны на сайце ўстановы адукацыі, інфармацыйным стэндзе «Лета-2022».

Праведзена абсталяванне месцаў адпачынку непаўналетніх (гульнявой пляцоўкі, школьнага стадыёна) на прадмет падрыхтоўкі да летняга правядзення часу непаўналетніх, складзеныя адпаведныя акты.

Кожны месяц распрацоўваліся міжведамасныя планы на летні перыяд, дзе ўказваліся праводзяцца мерапрыемствы ў аграгарадку Турэц на базе ўстановы адукацыі, сельскай бібліятэкі, АКіД "Турэцкі Дом культуры". Складзены графік работы школьнага стадыёна, кабінета інфарматыкі, вёўся журнал выдачы спартыўнага інвентару. На базе ўстановы адукацыі арганізавана работа маладзёжнай гульнявой пляцоўкі "З.М.С." (Здароўе. Маладосць. Сіла) (чэрвень), гульнявой пляцоўкі «Кола народных гульняў» (жнівень). На сайце ўстановы адукацыі кожны тыдзень размяшчаліся анонсы мерапрыемстваў. План міжведамасных мерапрыемстваў быў размешчаны на сайце ўстановы адукацыі, на стэндзе «Лета-2022», у тэлеграм-канале «Лета-2022 Карэлічы».

Для задавальнення патрэбаў вучняў у розных відах дзейнасці і набыцця імі карысных навыкаў на базе ўстановы адукацыі была арганізавана работа ДАЛ «Юныя алімпійцы» і ЛПА «Садружнасць». З 29.06.2022 па 22.07.2022 у ДАЛ лагеры «Юныя алімпійцы» прайшлі аздараўленне 13 навучэнцаў, у ЛПА «Садружнасць» - 9. Усяго за летні перыяд у ДАЛ "Вясёлка " аздаравіліся 19 навучэнцаў, у НДААЦ "Зубраня" - 1 навучэнец, у Зельвенскай дзяржаўнай санаторнай школе– інтэрнат – 1 навучэнец. Працэнт аздараўлення за лета 2022 года склаў 69,4%.

Вялікая ўвага ў рабоце лагера «Юныя алімпійцы» і ЛПА «Садружнасць» надавалася навучанню непаўналетніх патрабаванням бяспекі у час знаходжання ў лагеры, на стадыёне, падчас правядзення спартыўных заняткаў і масавых мерапрыемстваў, а таксама правілам і мерам бяспечных паводзін на дарогах, транспарце, лесе, грамадскіх месцах. 28 чэрвеня навучэнцы 2-9 класаў прынялі ўдзел у рабоце дзіцячага сельскага сходу, які праходзіў базе аг. Ярэмічы. У час мерапрыемства супрацоўнікі МНС, РАУС, таврысва выратавання на вадзе ў займальнай форме тлумачылі дзецям пытанні бяспекі ў летні перыяд. Фота матэрыялы размешчаны на сайце ўстановы адукацыі. У рамках рэалізацыі мерапрыемстваў праекта "Лета-2022" арганізаваны ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных Году гістарычнай памяці, мерапрыемствах, прысвечаных Дню ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа, Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь: мітынгу-рэквіум "У сэрцы стукаецца памяць", уроку мужнасці "Гераічныя старонкі малой радзімы", віктарыне " Гістарычныя месцы Беларусі", музейных уроках "У Радзімы маёй шлях нялёгкі таксама..." у рамках культурна-асветніцкага марафону "Час вымяраецца памяццю", уроку мужнасці "Марачы аб будучым - памятай аб мінулым", мітынгу «Ганаруся сваёй зямлёй», удзел у киномарафоне «Глядзі і помні» і інш.

Забяспечаны ўдзел у рэспубліканскіх акцыях і конкурсах “Спартыўнае лета», Рэспубліканскім фестывалі метадычных распрацовак па арганізацыі тэматычных заняткаў па валанцёрству. Працягнута рэалізацыя інфармацыйна-адукацыйнага праекта «Школа актыўнага грамадзяніна».

За перыяд летніх канікул было арганізавана 5 аднадзённых паходаў з наведваннем гістарычных месц нашага рэгіёна ў рамках Усебеларускай маладзёжнай экспедыцыі “Маршрутамі памяці. Маршрутамі адзінства", 2 экскурсіі ў межах аграгарадка Турэц, 3 - у межах Карэліцкага раёна, 1 экскурсія з наведваннем аб'ектаў Навагрудскага раёна, 1 экскурсія ў г.Мінск з наведваннем гісторыка-культурнага комплекс"Лінія Сталіна". Фота і відэа справаздачы экскурсійнага марафону «Дзіцячы аўтацягнік» накіраваныя ў НДААЦ «Зубраня».

У жніўні 5 вучняў установы адукацыі былі задзейнічаны ў другаснай занятасці на базе Карэліцкага раённага цэнтра занятасці насельніцтва.

На працягу летніх канікул працаваў цімураўскі атрад пад кіраўніцтвам педагога-арганізатара Гарох Т. В. Вучні ўдзельнічалі ў акцыі «Спяшайцеся рабіць дабро», «Помнік», «Чысты школьны двор».

На ўзроўні дашкольнай адукацыі ў летні перыяд працавала 1 рознаўзроставая група дзяцей ва ўзросце ад 2 да 6 гадоў. Летнімі аздараўленчымі мерапрыемствамі было ахоплена 25 выхаванцаў. Асноўную частку часу дзеці праводзілі на свежым паветры, прымалі паветраныя і сонечныя ванны, гулялі з пяском і вадой, развучвалі разнастайныя рухомыя гульні.

Шырока практыкуецца правядзенне спартыўна - музычных забаў, вывучэнне беларускіх народных гульняў, чытанне беларускіх народных казак, літаратурных твораў, праслухоўванне песень на тэму «Наша Радзіма – Рэспубліка Беларусь», разглядванне карты Рэспублікі Беларусь, фотаздымкаў архітэктурных помнікаў краіны.

Такім чынам, у выніку арганізаванай работы педагагічным калектывам ва ўстанове адукацыі ў летні перыяд забяспечана занятасць і аздараўленне навучэнцаў, адсутнічаюць выпадкі здзяйснення злачынстваў і правапарушэнняў.

Намеснік дырэктара па ВВР І.В.Лазун